✓**26 жніўня** ў галерэі «Панарама» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прайшло адкрыццё фотавыставы Марыны Бацюковай **«Вопыт прысутнасці»**, прымеркаванай да 30-годдзя творчай дзейнасці фотамастачкі. Яна ўдзельніца і куратар шматлікіх выставаў і праектаў у Беларусі і за мяжой, член Беларускага саюза мастакоў, Беларускага грамадскага аб'яднання фатографаў.

На выставе прадстаўленая серыя здымкаў, зробленых пад час падарожжаў па Германіі, Ізраілі, Азербайджане, Грузіі, Францыі і Арменіі ў 2014 – 2015 гг. Гэта візуальны дзённік уражанняў. Здымкі дэманструюцца ў Беларусі ўпершыню.

Плануецца, што выстава будзе працаваць да канца кастрычніка.